Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 ЛЮТАГА 2018 г. АЎТОРАК № 25 (28641)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Ці стане больш стартапаў дзякуючы Дэкрэту № 8?**

СБ



**Спартсмены ЕАЭС на Алімпіядзе**

СБ



**Расія ў дзённіках Рыгора Барадуліна**

СБ

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Андрэй ГАЕЎ, старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці:**

*«Дзяржкаммаёмасць ажыццяўляе шматбаковую дзейнасць, накіраваную на праводзенне адзінай палітыкі ў галіне зямельных і маёмасных адносін, геадэзіі, картаграфіі, рэгістрацыі, ацэначнай дзейнасці. Найбольшая колькасць зваротаў грамадзян да нас датычыцца зямельных пытанняў. Зваротаў становіцца менш. Як паказвае практыка, звароты, якія патрабуюць вырашэння пытанняў у нарматыўным плане, даўно не было. Гэта сведчыць аб тым, што заканадаўства ў сферы зямельных адносін, рэгістрацыі нерухомасці сфарміравана і працуе. Як правіла, у аснове зваротаў ляжаць нявырашаныя адносіны, канфлікты паміж людзьмі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.02.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9808 | ▲ |
| Еўра | 2,4665 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0350 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0714 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Лыжныя выхадныя



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Нядзеля. Сілічы.

Больш здымкаў глядзіце на сайце zviazda.by

■ Адпачынак-2018

## ПАДАРОЖЖА Ў ЧАСЕ, ВЯЧЭРА Ў ПАНІ ПЫШКІ, ХАДЖЭННЕ ПА ВАДЗЕ

### Турыстычны сезон абяцае быць насычаны ўражаннямі і адкрыццямі

**Уявіце толькі: прафсаюзны тураператар сёння прапануе каля 500 маршрутаў! Прычым беларусы і госці нашай краіны змогуць выбраць для сябе не толькі новыя напрамкі. Прадстаўнікі турындустрыі шукаюць розныя падыходы да падачы экскурсій, насычаюць іх інфармацыяй, аздабляюць анімацыяй.**

СТАР. 13



**Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Міхаіл ОРДА падчас адкрыцця турыстычнай выставы «Прафтур-2018».**

■ Праблемы і рашэнні

## КАРП ПА-ЛЮБАНСКУ

### Як рыбгас выходзіць з заняпаду



Фота БЕЛТА.

**Рыбная галіна Беларусі выходзіць на новы ўзровень: на прылаўках крам з'яўляецца ўсё больш рыбы ўласнай вытворчасці. Гэта не толькі карп, таўсталобік, белы амур, сом, шчупак, карась, але і асятровыя. «Звязда» неаднойчы пісала аб цяжкім становішчы, што склалася ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Рыбакамбінат «Любань».**

У 2012 годзе тут пачалося будаўніцтва цэха па выпуску рыбных кансерваў. Планавалася, што вытворчасць запусцяць у 2015-м. Але працэс прыпыніўся. Справа ў тым, што былое кіраўніцтва прадпрыемства закупіла старую лінію ў Калінінградзе, якая прызначалася для перапрацоўкі буйной акіянічнай рыбы, а ніякім чынам не «прадстаўнікоў» сямейства карпавых. Прычым розныя дэталі абсталявання не стыкаваліся паміж сабой. У выніку машына замест таго, каб адсякаць у рыбы галаву і хвост, періразала яе папалам. Таму асобныя аперацыі даводзілася выконваць уручную. Справы паступова пачалі наладжвацца, калі рыбгас узначаліў вопытны кіраўнік Валерый Гормаш.

СТАР. 4